Дзяржаўная установа адукацыі
«Гімназія № 6 імя Ф.Э. Дзяржынскага г. Гродна»

# Тыдзень пачатковай школы "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына"

Галубовіч Таццяна Уладзіміраўна
кіраўнік МА настаўнікаў
пачатковых класаў,
выхавальнікаў ГПД і
настаўнікаў-дэфектолагаў

2021-2022 навучальны год

"Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына..." На сенняшні дзень гэтыя радкі вядомага беларускага пісьменніка Янкі Купалы гучаць вельмі актуальна. У гімназіі №6 імя Ф.Э. Дзяржынскага горада Гродна прайшоў тыдзень пачатковай школы, прысвечаны нашай роднай краіне- Беларусі.

Мэта: спрыяць развіццю пазнавальнай актыўнасці, даследчых, творчых, камунікатыўных уменняў вучняў, выхаванню патрыятызма.

План тыдня пачатковай школы
"Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына"

| Назва блока | Мерапрыемства |
|---|---|
| О край мой мілы!.. Усёй душою хачу злучыцца я з табою! | Фотазона "Мая Радзіма- Беларусь" |
| | Акцыя " У адзінстве- наша сіла" |
| | Гутарка "Дзяржаўныя сімвалы Беларусі" |
| | Конкурс чытачоў "Люблю мой край, старонку гэту" 1-4 класы |
| | Гульня-падарожжа "Мая Беларусь" (4 класы) |
| | Развіваючы занятак у ГПД "Радзіма пачынаецца з мяне" |
| | Майстар-класс "Закладка з сімвалам Беларусі" |
| Таленты зямлі беларускай | Цікава ведаць "Хто такі Ф. Скарына" (1 класы) |
| | Камандная гульня "Мая Беларусь" (2 класы) |
| | Онлайн-віктарына "Мой родны кут" (3 класы) |
| | Алімпіяды па матэматыцы, рускай мове, беларускай мове, прадмету "Чалавек і свет" (4 класы) |
| | Выстава "Знакамітыя землякі" (4 класы) |

| | |
|---|---|
| Берарруская скарбонка | Выстава "Сямейныя рэлiквii"<br>(1-4 класы) |
| | Праект "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына"<br>(1, 2 класы) |
| | Прыказкі ў малюнках<br>(3 класы) |
| | Казачны рэйд "Як Міхалка гусей дзяліў"<br>(3 класы) |
| | Час пацехі "Народныя гульні" |
| | Літаратурна-музычная кампазіцыя "Песні і казкі роднай зямлі"<br>(4 класы) |
| Зямля пад белымі крыламі | Загадкі "Ляснымі сцежкамі"<br>(1 класы) |
| | Спаборніцтва "Перакладчык"<br>(2 класы) |
| | Віктарына "Беларусь мая сінявокая"<br>(2 класы) |
| | Матэматычны дыктант "Беларусь у лічбах"<br>(3 клас) |
| | Дыктоўка на выдатна "Беларуская прырода"<br>(4 класы) |
| | Конкурс малюнкаў "Беларускія краявіды"<br>(1-4 класы) |
| Гістарычная спадчына | Даследванне "Сем цудаў Беларусі"<br>(1 класы) |
| | Прэзентацыя "Беларусь помніць"<br>(2 класы) |
| | Падарожжа "Храмы Беларусі"<br>( 3 класы) |
| | Віртуальная экскурсія "Падарожжа па гораду Гродна"<br>( 4 класы) |
| | Работа з картай "Беларусь- краіна замкаў"<br>(4 класы) |

| | |
|---|---|
| | Фотакамера глядзіць у свет "Мая малая Радзіма" (1-4 класы) |
| | Занятак у музеі "Дзевятоўка ўчора, сення, заўтра" (3 класы) |

Дзень першы меў назву "О край мой мілы!.. Усёй душою хачу злучыцца я з табою!" Малодшыя школьнікі пагаварылі аб сваёй Радзіме, дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь, паразважалі, што можна назваць "спадчынай", якая засталася нам ад нашых продкаў. На першым паверсе была афармлена тэматычная фотазона, дзе кожны жадаючы мог зрабіць фотаздымак. Вучні і работнікі гімназіі прынялі ўдзел у акцыі "У адзінстве- наша сіла". Сярод малодшых школьнікаў адбыўся конкурс чытачоў "Люблю мой край, старонку гэту". У групе падоўжанага дня праведзены майстар-класы "Закладка з сімвалам" і развіваючы занятак "Радзіма пачынаецца з мяне".





Другі дзень тыдня пачатковай школы называўся "Таленты зямлі беларускай". Першакласнікі даведаліся пра Францыска Скарыну, яго ўклад у кнігадрукаванне ў нашай краіне. Вучні чацвёртых класаў сабралі матэрыялы пра лепшых беларускіх вучоных, музыкантаў, мастакоў, пісьменнікаў, спартсменаў, зрабілі выставу "Знакамітыя землякі". Гэтымі людзьмі, іх дасягненнямі павінен ганарыцца кожны беларус. Малодшыя школьнікі таксама мелі магчымасць праявіць свае таленты. Вучні другіх класаў прымалі ўдзел у камандрай гульне "Мая Беларусь". Дзеці з задавальненнем спаборнічалі, выконвалі заданні рознай цяжкасці. Выяўлены самыя лепшыя знатакі сярод трэцякласнікаў з дапамогай онлайн-віктарыны "Мой родны кут". Для вучняў чацвёртых класаў былі праведзены алімпіяды па матэматыцы, рускай мове, беларускай мове, прадмету "Чалавек і свет".




У трэці дзень тыдня "Беларуская скарбонка" малодшыя школьнікі дэманстравалі свае сямейныя рэліквіі, расказвалі пра рэчы, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, маюць духоўную каштоўнасць. У кожнай такой рэчы есць свая гісторыя, у кожнай сям'і- свая памяць аб продках. Была зроблена выстава "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына". Першакласнікі прадставілі рэцэпты беларускіх нацыянальных страў з агародніны, малака, круп, прысмакі і напіткі. Вучні другіх класаў сабралі матэрыял пра народныя святы: Каляды, Гуканне вясны, Купалле, Вялікдзень і Дзяды, а таксама пра рамествы: ткацтва, дрэваапрацоўку, ганчарную і кавальскую справы, салопляценне. Беларусь заўседы славілася сваімі майстрамі. Трэцякласнікі даследвалі фальклор. Дзеці паспрабавалі зрабіць малюнкі да прыказак пра Радзіму, мову, сям'ю, працу, вучобу, сяброўства, каханне, прыроду. Была падрыхтавана інсцэніроўка беларускай народнай казкі "Як Міхалка гусей дзяліў". Маленькія артысты паказалі лялечны спектакль у паралелі трэціх класаў. У групе падоўжанага дня адбыўся час пацехі, дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у беларускіх народных гульнях. Сапраўдным падарункам была літаратурна- музычная кампазіцыя "Песні і казкі роднай зямлі". Кожны беларус павінен ведаць свае карані, традыцыі сваей краіны, сваю беларускую скарбонку.






Чацверты дзень пачатковай школы "Зямля пад белымі крыламі" прысвечаны прыродзе Беларусі. Першакласнікі ў гульневай форме разгадвалі загадкі пра жывельны і раслінны свет. Сярод вучняў другіх класаў прайшла віктарына "Беларусь мая сінявокая", дзеці пазнаеміліся з багатым мірам рэк і азер. Спаборніцтва "Перакладчык" выявіла самых лепшых мовазнаўцаў. Трэцякласнікі напісалі матэматычны дыктант "Беларусь ў лічбах". Вучні чацвёртых класаў спаборнічалі ў напісанні дыктоўкі "Бусел". Малодшыя школьнікі прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў "Беларускія краявіды", адлюстравалі беларускую прыроду, паказалі яе непаўторнасць і прыгажосць. Удзялілі ўвагу і ахове прыроды, пагаварылі аб ролі кожнага чалавека і дзяржавы ў зберажэнні прыродных багаццяў, успомнілі, якія расліны і жывелы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.





Апошні дзень тыдня пачатковай школы быў прысвечаны нашай гістарычнай спадчыне. Вучні першых класаў правялі даследванне па тэме "Сем цудаў Беларусі". Трэцякласнікі віртуальна падарожнічалі па храмах Беларусі, наведалі гімназічны музей. Вучні другіх класаў паглядзелі прэзентацыю "Беларусь помніць", дакрануліся да гісторыі нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вучні чацвертых класаў працавалі з картай па тэме "Замкі Беларусі", віртуальна падарожнічалі па гораду Гродна. У кожнага малодшага школьніка была магчымасць расказаць пра сваю малую Радзіму, прынесці фотаздымкі. Падведзены вынікі тыдня пачатковай школы "Ад

прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына", самым актыўным уручаны граматы.








Хочацца адзначыць, што кожны беларус павінен усвядоміць, што наша Радзіма з яе прыгожай прыродай, багатымі традыцыямі, таленавітымі, працавітымі і гасціннымі людзьмі з'яўляецца сапраўдным скарбам, спадчынай, якая засталася нам ад продкаў. Мы людзі адной гісторыі, аднолькавай сучаснасці і агульнай будучыні, толькі ад нас і ад нашых нашчадкаў залежыць лёс сінявокай, мірнай і квітнеючай Беларусі!